**Тэматычная інфармацыйная гадзіна “Газета, як люстэрка жыцця”.**

**Т. М. Сурага**,
настаўнік гісторыі вышэйшай
катэгорыі, класны кіраўнік 11 класа

Мэта: знаёмства вучняў з гісторыяй з’яўлення газет.

Задачы: выклікаць цікавасць да перыядычнага друку;
паказаць спосабы знаходжання інфармацыі ў друкаваным слове;
садзейнічаць развіццю навыкаў аналізу, параўнання, вуснага маўлення.

Форма правядзення: інфармацыйная гасцёўня.

Абсталяванне: выстава газет і часопісаў, падборка нумароў раённай газеты “Новае жыццё”, мультымедыйная прэзентацыя.

Ход класнай гадзіны.

**І. Камертон-настройка**.

*Настаўнік*: Дарагія вучні, нашу інфармацыйную гадзіну мы прысвячаем вельмі важным рэчам, якія можна сустрэць у кожным доме. Яны цікавыя і прэзідэнту і рабочаму, настаўніку і ўрачу, ваеннаму і інжынеру. І паколькі ў нашым класе яны занялі пачэснае месца, я прашу іх назваць.*(Газеты і часопісы).*

**ІІ. Індывідуальная работа.**

Заданне: Карыстаючыся слоўнікам, запоўніць інфармацыйную карту:

Заметка-

Артыкул-

Рубрыка-

**ІІІ.Эўрыстычная гутарка.**

- Для чаго людзям патрэбны газеты і часопісы?
- З прапанаваных выданняў выдзеліце асобна газеты і часопісы. Чым на вашу думку яны адрозніваюцца?
- Якія газеты і часопісы прыходзяць у ваш дом?

**IV. Апераджальныя заданні.**

Прэзентацыя “З гісторыі газеты”. Прадстаўляюць вучні,якія выступаюць у ролі карэспандэнтаў з розных краін і розных эпох на фоне гістарычных інсталяцый адпаведнага перыяду.

*Вучань- рэпарцёр з Італіі*: А ці ведаеце вы адкуль пайшло слова газета? Тады перанясёмся ў далёкую Італію. Венецыя знакаміта не толькі сваімі каналамі, але яшчэ і тым, што тут з’явілася першая гарадская газета. На плошчы вывешваліся вялікія лісткі бумагі,з якіх гараджане даведваліся аб падзеях, што адбываліся ў горадзе. Некаторыя гараджане хацелі ўзяць лісткі дадому і абмеркаваць іх з роднымі. Тады ўлады вырашылі браць плату з тых, хто хоча карыстацца газетай. Патрэбна было заплаціць дробную манету, якая называлася “гасета”. Адсюль і пайшла назва друкаванага выдання- газета. Манета так называлася, бо на ёй была намалявана сарока, якая ведае ўсе навіны і на сваім хвасце іх разносіць. Дарэчы, у Рыме пры імператары Юліі Цэзары ўзнік першы інфармацыйны бюлетэнь. У ім змяшчаліся аб’явы ўрада і называўся ён “Падзеі тыдня”.

*Вучань- рэпарцёр з Кітая*: 13 стагоддзяў назад урад Кітая выпусціў газету “Тчынь-Пао”, “Навіны сталіцы”, у якой апавядалася пра важнейшыя падзеі.

*Вучань- рэпарцёр з Расіі*: Першая газета ў Расіі стала выдавацца ў 1702 годзе па загадзе Пятра І. Ён сам адзначаў алоўкам з галандскіх газет, што патрэбна перакладаць на рускую мову і друкаваць.

*Настаўнік*: Першая газета ў Беларусі- “Наша ніва”, якая была заснавана ў 1906 годзе. У Народным гісторыка-краязнаўчым музеі нашай школы

ёсць адзін яе нумар. Калі ласка, дакраніцеся да гісторыі друкаванага слова, разгледзьце яго.

**V. Групавая работа.**

З прапанаваных вам газет вызначце, якія выдаюцца ў краіне, абласным цэнтры, у нашым раёне. Вызначце, якія ёсць заметкі, артыкулы, рубрыкі?

**VI. Інтэрв'ю.**

*Настаўнік:* Для таго каб сабраць цікавы матэрыял патрэбна праца карэспандэнтаў. У нашым класе была створана група ўласных карэспандэнтаў, якія спрабавалі ўзяць сваё першае ў жыцці інтэрв' ю. Давайце звернемся да відэарада.

**VII. Аналітычная дзейнасць.**

*Настаўнік:* Нашы аналітыкі сустрэліся з начальнікам паштовага аддзялення аграгарадка Валеўка Мялешка В.М., іх задача была вызначыць, якія выданні найбольш запатрабаваныя нашымі аднавяскоўцамі.

*Аналітыкі прапануюць "Прэсс-лествіцу"*, дзе прадстаўлены самыя папулярныя выданні ў чытачоў Валеўскага сельскага савета: газеты "Беларусь сегодня", "7дзён", і з вялікім адрывам лідзіруе раённая газета "Новае жыццё".

**VIII. Бліц-апытанне.**

Па чарзе, калі ласка, падыміце рукі, чыя сям'я выпісвае газету "Беларусь сегодня", "7дзён", "Новае жыццё". Як бачым, наша бліц-апытанне пацвярджае даныя аналітыкаў.

**IX. Рэдакцыйны прайс-ліст.**

*Настаўнік*: Вы атрымалі заданні знайсці артыкулы у раённай газеце "Новае жыццё" аб людзях, якіх вы ведаеце, яны жылі ці жывуць у нашай вёсцы. Магчыма, гэта вашы бацькі, сваякі, вучні нашай школы.

*Прэзентацыя артыкулаў.*

**X. Дыялог з гасцямі.**

Слова маюць супрацоўнікі раённай газеты “Новае жыццё”, якія расказваюць аб тым, як ствараецца газета. Вучні прапануюць ім свае артыкулы і вершы для друку.

**XI. Заключнае слова настаўніка.**